Материалы
Международной
научно-практической
конференции

# Мониторинг качества педагогического образования: теоретико-методологические основы и пути решения

21—22 марта 2007 г.
г. Барановичи,
Республика Беларусь

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
«БАРАНОВИЧСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ»

Педагогический факультет

# МОНИТОРИНГ КАЧЕСТВА ПЕДАГОГИЧЕСКОГО ОБРАЗОВАНИЯ: ТЕОРЕТИКО-МЕТОДОЛОГИЧЕСКИЕ ОСНОВЫ И ПУТИ РЕШЕНИЯ

## МАТЕРИАЛЫ МЕЖДУНАРОДНОЙ НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКОЙ КОНФЕРЕНЦИИ

21—22 марта 2007 г.
г. Барановичи
Республика Беларусь

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Барановичи
РИО БарГУ
2007

УДК 37(075.8)
ББК 74я73
М74

*Печатается по решению научно-методического совета учреждения образования «Барановичский государственный университет» (протокол от 28.03.2007 № 7)*

Рецензенты:

*Л. Малиновска*, доктор педагогических наук, Латвийский сельскохозяйственный университет, Латвия;
*Н. Я. Игнатенко*, доктор педагогических наук, профессор, Крымский гуманитарный университет, Украина

Редакционная коллегия:

Е. И. Пономарёва (главный редактор),
Ю. В. Башкирова, Г. И. Волчок, В. И. Денищик, Н. В. Ермалович, В. Н. Зуев, Е. Н. Карапетова,
З. Н. Козлова, З. В. Лукашеня, Ю. В. Маслов, Т. И. Нестерович, С. А. Порозов, Л. И. Станиславчик,
К. С. Тристень, Л. В. Урбанович, В. В. Хитрюк, О. М. Шпель

М74 **Мониторинг качества педагогического образования : теоретико-методологические основы и пути решения :** материалы Междунар. науч.-практ. конф., 21—22 марта 2007 г., г. Барановичи, Респ. Беларусь / редкол. : Е. И. Пономарёва (гл. ред.) [и др.]. — Барановичи : РИО БарГУ, 2007. — 344 с. — 100 экз. — ISBN 978-985-498-081-2

В материалах докладов освещаются актуальные проблемы мониторинга качества педагогического образования, рассматриваются его организационно-управленческие вопросы, аспекты определения критериев и показателей качества, опыт работы учреждений образования и, в частности, преподавателей. В сборник вошли материалы, отражающие результаты теоретических и практических исследований, проведенных в педагогических вузах Беларуси и зарубежья.

Сборник представляет интерес для широкого круга специалистов сферы педагогического образования, преподавателей, аспирантов, студентов вузов.

**УДК 37(074.78)**
**ББК 74я73**

ISBN 978-985-498-081-2

© Коллектив авторов, 2007
© БарГУ, 2007

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## КРЫЖОВЫ МЕТАД У ДАСЛЕДАВАННІ АСАБІСТАГА ЎЗРОСТУ

**Л. Л. Кубанская, Я. Л. Маліноўскі**

Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт»,
г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь, pf-barsu@ tut.by

**Резюме.** Психологическая культура — это глобальное упорядочение современной знаковой системы в личности гражданина — преподавателя, студента. В случае ее недостатка личностно-индифферентная бесхарактерность социального индивида может в скором времени привести к тупиковой ситуации в его самообразовании. Через Я-квинтэссению психологическая культура выявляет деятельность (Energiageist) непрерывного процесса порождения ценностей смыслов и достоинства значений личности в духовной перспективе ее роста.

**Abstract.** The Crusade Method presenting the radical (root) premise of signification of the psychological subject or the phenomenon, corresponds with anybody, who is able to be free from illusions of possession of an absolute (monographic) position and to become not only informed, but transactualised in the object under study. Elemental discursive mediation of affective dispositions of the person assumes an innovation in the universe of education, narrative projectionю.

**Ключавыя тэрміны:** асабісты ўзрост, дыскурс, наратыў, кангітыўная карта, крыжова-семантычны метад, Я-квінтэсенцыя, канструкцыя, трансактуалізацыя.

Апошнім часам назіраецца пераход навуковага асэнсавання асобы ад наматэтычнага, прыроднанавучага да ідыяграфічнага, духоўнага спосабу яе даследавання. Адукацыйная праблема асобы змяшчае ў сабе ўяўленне аб прасторавай вяршыні *(Akme)* развіцця чалавека, звяраючага свой «хранатоп» (М. Бахцін) з Евангельскай Галгофай альбо з выбітнымі падзеямі гісторыі, накшталт Галілеявай індукцыі «усё ж такі яна круціцца!». Этымалогія дзеясловаў *круціцца* і *crucio* (з лац. мучыць, крыжаваць) сцвярджае прынцып культурнай адноснасці, згодна якому псіхалінгвістычнае структураванне арганізму аўтаномна ад яго фізічнага развіцця, калі ўключае ў сябе лагічны выток [3].

Духоўная вартасць узросту *verum corpus*, Сапраўднага Цела, мае сваім вытокам канкрэтна-гістрычную асобу: «...пакуль усе мы прыйдзем у еднасць веры і пазнанне Сына Божага, у мужа дасканалага, у меру пэўнага ўзросту Хрыстова» [Эф 4, 13]. Дасканалы ўзрост Хрыста з'яўляецца вытокам мэтай і мерай кожнага «для будаўніцтва сябе самога ў любові» [Эф 4, 16]. Дадзенае вызначэнне патрабуе кампетэнтнага ўзроўню псіхалогіі ментальнасці.

У адрозненне ад гнасеалагічнай суб'ектнасці як герметычнай самасвядомай сістэмы ментальная свядомасць валодае першапачатковай духоўнай суадноснасцю з вытокам сапраўдных ведаў, адцяняючых несамадастатковасць крытычнага інтэлекту, які існуе для прадметнага досведу ўласнага быцця.

Постхрысціянская акадэмічная рэчаіснасць у сваёй крыжовай непрытомнасці рахмана рухаецца да выхаду з метадалагічнага крызісу навукі. Крыж, ініцыятыўна адэкватны антагенезу асобы, адначасова інтэгруе філагенэз нацыі, якія служыць якарам быцця і свядомасці Ізраіля як усяго народа Божага. Ж. Дэрыда, адзін з выбраных навукоўцаў, хто ініцыятыўна «пакапаўшыся» ў тэкстах Святога Пісьма, а таксама ў тэкстах К. Маркса, З. Фрэйда, Р. Барта, М. Бубера, выявіў лінгвістычны элемент *difference* «след-следа»[2], які лібералізуе *crucificsus* (укрыжаванне) логаса ў сучаснай сацыялогіі і ўсталёўвае яго квазі-адсутнасць як у контэнплятыўнай (сузіральнай) этыцы ўсходняга апофатызму (теозіс), так і граматалагічнай эстэтыцы заходняга канструктывізму (дыскурс).

Дыскурсная дэканструкцыя накладзе схему Ψ (сімвал псіхалогіі) на канфігурацыю Я-квінтэсэнцыі. У выніку калажу «прыроджаная ідэя» дэкартаўскага крыжа робіцца універсальным інструментам вымярэння культурна-метафізічных вытокаў асобы. Авалоданне імі немагчыма без тэалагічнай пераемнасці. Псіхалагічныя кампаненты з *Summa theologia* Фамы Аквіната таксама вымяраюцца крыжовымі каардынатамі: «Зло, узятае само па сабе, ёсць нішто». Кожная рэч валодае інтэнцыяльнасцю як імкненнем да самое сябе, і ў гэтым яе дабро. «Добры чалавек — інтэнцыяльна адбыўшыся, альбо шчаслівы. Але для таго, каб быць шчаслівым, — кажа Аквінат, — трэба паступаць, "мадэляваць" у вызначаны спосаб, мець выбар, гэта значыць быць асобай. Глыбокім вытокам усяго з'яўляецца любоў» [3, с. 232].

Тэалогія Крыжа стала пачаткам маніторынгу інтэрферэнцыі навукі, мастацтва і рэлігіі ў мэтах аўтахтоннага вызвалення асобы як «найпрыгажэйшай з тварэнняў Божых». Тамісцкі «прымат інтэлекту над верай» паслужыў лібералізацыі даследавання ва ўмовах навуковага прэдэтэрмінізму: «немагчыма, каб адно і тое ж было б для аднаго і таго ж чалавека і аб'ектам навукі, і веры: тое, у што прапануецца ўвераваць усім без разбору, не становіцца прадметам навуковых пошукаў, гэта рэчы, якія адносяцца толькі да веры» [3, с. 36]. З пункту гледжання тамізму, фізічная прэдэтэрмінацыя ласкі Божай настолькі папераджальная чалавечай волі, што гэтая апошняя не можа памясціць свайго бяздзеяння і бязладдзя з гэтым пабуджальным падахвочваннем славы Божай і шчасця тварэння. Іншымі словамі, мова доказу і веры атрымлівае натуральную магчымасць стаць саматоеснай. Так схаластыка эмансіпуе навуку ад рэлігіі, пакідаючы за апошняй трансцэндэнтны характар і непараўнальную ўзвышанасць. Псіхалогія у канчатку быць саматоеснай, і ў гэтым яе дабро. Калі для псіхолага дабро — тое, што паддаецца ўдасканаленню, набывае паўнату, прываблівае прыгажосцю і вартасцю, дык ён мусіць стаць дабрачынцам, гэта значыць свабодным. Чым свабадней, тым чалавечней, а чым чалавечней, тым псіхалагічней. Бо толькі ў такім разе навука спыняе сваю залежнасць ад кан'юктуры, якая чыніць перашкоду быцця па прыродзе, гэта значыць прыродзе Божай. Род, які памнажае сябе самога, і ёсць народ. Пазбяганне незадавальнення, залішняй трывогі і адказнасці жыцця засланяе чалавеку пачуццё рэальнасці, стымулюе перайманне і дагаджэнне аўтарытэту. Гэта *fuga horroi*, жахлівае бегства ад сябе самога як носьбіта народнасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Табліца — Узроставая перыядызацыя

| Перыяды | Адрэзак жыцця, год | Дзейнасць | Нованабытак |
|---|---|---|---|
| Пранатальны | Да нараджэння | Зачацце | Нараджэнне |
| Сямейнае дзяцінства | Да 7 | Гульня | Адвольнасць дзеяў, дэцэнтрацыя |
| Школьнае дзяцінства | 7–14 | Вучэнне | Самаацэнка |
| Падлеткавы стан | 14–21 | Зносіны | Рэфлексія |
| Юнацтва | 21–28 | Свядомасць | Перакананні |
| Ранняя маладосць | 28–35 | Сужэнскі стан | Пачуццё любові |
| Асвечаная маладосць | 35–42 | Праца | Сям'я |
| Пладаносная маладосць | 42–49 | Кіраўніцтва | Прафесіяналізм |
| Сацыяльная сталасць | 49–56 | Абагульненне вопыту | Годнасць |
| Вяршыня шляху | 56–63 | Настаўніцтва | Мудрасць |
| Сталасць | 63–70 | Служэнне роду | Генеалогія |
| Сталы ўзрост | 70–77 | Старчаства | Празарлівасць |
| Старасць | 77–84 | Бенэдыкцыя, славаслоўе | Успенне, смерць |
| Святасць | Па смерці | Запавет | Нязміручасць |

выдзяленне ў табліцы дзейнасці зусім не вызначае рэальнае замяшчэнне пяці глабальных відаў. Так, напрыклад, «зачацце» ў таблічным слупку «дзейнасць» насамрэч не далучае яго да самастойнай катэгорыі. Гэтую справу мы схільны лічыць толькі асобным відам дарослай гульні. У той жа час дзейнасць адпачынку нельга далучыць да гульні, напрыклад, сон не падпадае пад гэту катэгорыю.

Цэнтральным для ўзроставай перыядызацыі застаецца пытанне ёе [illegible] працэсу і выніку дзейнасці як сацыяльна-псіхалагічнай мэтазгоднасці. Суадносна палажэнням Л. С. Выгоцкага, А. Н. Лявонцьева і іх школ аб узнікненні гульні ў адказ на грамадскія патрэбы выяўляецца праблема залежнасці экстэнсіўных форм гульні ад інтэнсіўнасці працы, багаслоўскі сэнс якой утрымлівае ў сабе побач з утылітарнымі выхаваўчыя экспектацыі выкупу *(redemptio)*. Такая матывацыя кваліфікуе працу як сродак рэалізацыі індывідуальнасці чалавека. Праца як неабходнасць культывуе ў ім пачуццё рэальнасці, меру суб'ектыўнай цнатлівасці, што ўраўнаважвае мэту і матывы дзейнасці. Так, дзетародная дзейнасць суправаджаецца працэсуальна-гульнёвым матывам асалоды, які пры адсутнасці гэтай меры узурпуе функцыю і дыскрэдытуе мэту дзетанараджэння як славы Божай. Адпаведнасць функцыі і мэты з'яўляецца нарматыўнай умовай здаровага ладу жыцця мужчыны і жанчыны як вобраза Божага, памножанага ў Яго генеалогіі.

Перавага матывацыйна-працэсуальнай функцыі над мэтавым намерам служэння абумоўлівае прагрэсс у свеце інфантыльнага матыву «игривости» (lusio), у тым ліку гульню слоў *(lusus verborum)*, аб чым кампетэнтна засведчыў Й. Хейзінга ў сваёй працы "Homo Ludens" [6]. Прапанаваная схема ўзроставай перыядызацыі прызначана зарыентаваць асобу на размеркаванне працоўных матываў, падпарадкаваных канечнай мэце быцця, па-за межамі фізічнага існавання чалавека ў яго генеалогіі.

Вядучая дзейнасць вызначанага ўзросту не заканчваецца перыядам развіцця, але ўваходзіць у агульную структуру жыццядзейнасці, пры якой функцыі вядучага і вядомага змяняюцца ў сувязі з замежнасцю асабістай актыўнасці, пераходзячай у новую якасць як плод пераканаўчай працы. «Ад набытку сэрца прамаўляюць вусны. Добры чалавек ад добрага скарбу выносіць добрае, а ліхі са злога скарбу выносіць злое» [Мц 12, 35]. Так сацыяльная сітуацыя папярэджвае і [illegible] развіццё духоўнай канстантнасці ў міжасабовых зносінах, а вядучая дзейнасць, замежная самому моманту зачацця, прэвентуецца адносінамі любові сужонкаў. Адсутнасць любові прыводзіць да выпадковага апладатварэння. Любоў адпадае ва ўмовах «случайной случки».

Прафесійная педагагічная дзейнасць з'яўляецца дзейнасцю служэння, якая патрабуе цітанічных высілкаў у прынашэнні своечасовага плоду ўлады выкладчыка і перакананняў яго спадзвіжнікаў — вучняў. Не абмежаваная маладым узростам прафесійная дзейнасць здзяйсняе якасны скачок пры ўваходзе ў склад і структуру дзейнасці «кіраўніцтва» як этапа асабістага сталення. У сваю чаргу, кіраўніцтва як вядучы від дзейнасці не можа быць з чалавекам пажыццёва, але суадносна яго нямогласці абмежавана ўзрастае ў новы жыццёвы цыкл, пры якім некалі вядучая дзея становіцца вядомай, а гэтая апошняя таксама не стаіць на месцы, асэнсуецца ў тэарэтычны спосаб і такім чынам удасканальвае (напрыклад, у настаўніцтве). Так, усякі ўзроставы перыяд перадае эстафету новай жыццёвай фазе развіцця з тым, каб і само развіццё не было самамэтаю, а патэнцыялам для самаактуалізацыі асобы. Перспектыва ўзросту, безумоўна, змяшчае ў сабе выключэнні з правілаў, тым не менш выключае і затрымкі псіхалагічнага ўзросту ў плане свядомасці асобы адносна допуску сумяшчальнага і несумяшчальнага: што прабачальнае для юнака — асуджальнае для старца, які затрымаўся ў сваім развіцці, не дасягнуўшы свайго «акме».

Кожны ўзроставы перыяд азначаны напружанай душэўнай працай па пераадоленні тэнэтаў узросту. Пачуццё меры ва ўсім распаўсюджваецца на сферы жыццядзейнасці так, каб гульня не падмянілася дэманстрацыяй, вучэнне — «прывучанай бездапаможнасцю» (М. Селігмен), праца — любоўю да працы («трудоголизм»), зносіны — легкадумнай безадказнасцю, служэнне — прыслужніцтвам, кіраўніцтва — дыктатам, настаўніцтва — начотніцтвам. Паслядоўны пераход ад узросту да ўзросту, своечасовы зыход з займаемай пасады — абавязак і поспех ганаровай асобы. Паспець рэалізаваць сябе — вось матыў успення, гэта значыць усыплення з пачуццём выкананага



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

абавязку. Малітва, што суправаджае і матывуе ўсе ўзроставыя перыяды, напрыканцы шляху становіцца ўрэшце найбольш дасканалай у сувязі са звальненнем чалавека ад усіх яго зямных спраў, якія ён паспеў завяршыць.

Адзначаны вопыт відавочна прэзентуе эксперыментальна незалежную пераменную, якая сведчыць, што канфесійна-прававыя стасункі знаходзяцца ў адзінай плоскасці культуры, як два бакі медалю. Пры гэтым мы наўмысна разводзім паняцці «канфесійнасць» і «рэлігійнасць». Апошняя ірацыянальна, прыхільна да патэрнаў, якія часта дэструктыўныя сваімі парадаксальнымі драйвамі, накшталт «за царя і за веру», «за Родину, за Сталина», «джыхад». *Confession* як хрысціянскае веравызнанне, заснаванае на любові да бліжняга і благаслаўленні ворага, юрыдычна пастканвенцыйна і інтэнцыяльна маральна.

Такім чынам, псіхалагічная культура — гэта далейшае глабальнае ўладкаванне сучаснай знакавай сістэмы ў асобе грамадзяніна — выкладчыка, студэнта. У выпадку яе недахопу асабіста-індыферэнтная бесхарактарнасць сацыяльнага індывіда можа ў хуткім часе прывесці да тупіковых стасункаў адносна ўласнай адукацыі. Перасцярога апостала Якуба: «...не многія рабіцеся настаўнікамі, бо мы падвергнутыя большаму асуджэнню»[Як 3, 1] — накіравана на разуменне вечна дзіцячай інтэнцыі Духа: «...калі яны змоўкнуць, дык камяні загалосяць» [Лк 19, 40]. Камяні як абарона ад зла — гэта, перш за ўсё, скрыжалі Запавету, звышустойлівы тэкст чалавечага сталення. Праз Я квінтэсенцыю псіхалагічная культура выяўляе дзейнасць *(Energiageist)* няспыннага працэсу спараджэння каштоўнасці [illegible] і [illegible]насці значэнняў асобы ў духоўнай перспектыве ўзросту. У гэтай перспектыве нельга страціць тых [illegible]ных [illegible]лагічных падыходаў, якія стала спараджаюць перанос рэлігійных ведаў на навуковае інтэграванне псіхалагічнага вобраза «Я». Калі сістэма адукацыі павярнулася да яго тварам, то пара, згодна з Эклезіястам, «збіраць камяні».

### Спіс крыніц


1. *Бандура, А.* Теория социального научения / А. Бандура. — СПб. : Евразия, 2000. — 32[illegible] с.
2. *Гурко, Е.* Деконструкция : тексты и интерпретация. Дерида Ж. Оставь это имя (Постскриптум). Как избежать разговора : денегации / Е. Гурко. — Минск : Экономпресс, 2001. — 320 с.
3. *Жильсон, Э.* Томизм. Введение в философию св. Фомы Аквинского / Э. Жильсон. — М. ; СПб. : Университет. книга, 1999. — 406 с.
4. Кнігі Святога Пісання Старога і Новага Запавету. Біблія. — USA, 2002. — [illegible]35 с.
5. *Коломинский, Я. Л.* Психологическая культура или психологическая цивилизация / Я. Л. Коломинский // Псіхалогія. — 2001. — №№ 3, 4.
6. *Хейзинга, Й.* Homo Ludens. В тени завтрашнего дня : пер. с нидерл. / Й. Хейзинга ; общ. ред. и послесл. Г. М. Тавризян. — М. : Прогресс-Академия, 1992. — 464 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ